# ОРДЭНАНОСНАМУ МІНСКУ—СЛАВА!



ПОМНІК УЛ. І. ЛЕНІНУ ЛЯ ДОМА ЎРАДА БЕЛАРУСКАЙ ССР.
Фота І. Берліна.

## З УЗНАГАРОДАЙ, ЛЮБІМЫ ГОРАД!




За мужнасць і гераізм, самаадданую партызанскую барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі працоўных горада Мінска ў гады Вялікай Айчыннай вайны і за поспехі, дасягнутыя ў аднаўленні горада і ў развіцці народнай гаспадаркі, Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў сталіцу нашай рэспублікі—Мінск ордэнам Леніна. З вялікай радасцю за любімы горад успрынялі гэтую вестку прафесары, выкладчыкі, студэнты—усе супрацоўнікі нашага універсітэта. Мы ганарымся тым, што калектыў універсітэта, які носіць імя Ул. І. Леніна, упісаў не адну слаўную старонку ў ратныя і працоўныя справы Мінска. Прадстаўнікі універсітэта мужна змагаліся ў радах падпольшчыкаў і партызан горада, самаахдана працавалі на яго аднаўленні. Вучоныя універсітэта прыклалі нямала сіл для таго, каб яшчэ больш паскорыць развіццё індустрыяльнай магутнасці Мінска, забяспечыць яго высокакваліфікаванымі кадрамі.

Калектыў універсітэта горача віншуе любімы горад з узнагародай і абяцае заўсёды клапаціцца аб яго росквіце і славе.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 37 (648) Пятніца, 9 снежня 1966 года Год выдання XX. Цана 2 кап.

## *У гонар слаўнага юбілею*

*Споўнілася 25 год з дня разгрома нямецка-фашысцкіх захопнікаў пад Масквой. Шырока і ўрачыста адзначыў гэтую падзею калектыў нашага універсітэта. На факультэтах адбыліся гутаркі аб вялікай перамозе, сустрэчы з удзельнікамі абароны сталіцы Савецкага Саюза, былі арганізаваны фота- і кніжныя выстаўкі.*

*6 снежня перад шматлікай аўдыторыяй ва універсітэце выступіў былы начальнік штаба адной з брыгад — удзельніц бітвы пад Масквой палкоўнік у адстаўцы Мікалай Міхайлавіч Амелюстаў. З вялікай цікавасцю выслухана была яго прамова. Удзельнікі сустрэчы прагледзелі кінафільм аб Вялікай Айчыннай вайне.*

## ТВОЙ ПОДЗВІГ НЕЎМІРУЧЫ

Прадстаўнікі усіх факультэтаў універсітэта і замежныя студэнты ў мінулы аўторак сабраліся ў актавай зале галоўнага корпуса на ўрачысты мітынг, прысвечаны узнагародзе горада Мінска ордэнам Леніна. З вялікай радасцю быў праслуханы Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, які зачытаў начальнік па вучэбнай частцы В. С. Далгарукаў.

Слова прадстаўляецца Герою Савецкага Саюза дацэнту кафедры гісторыі КПСС А. А. Філімонаву. Прамяністай радасцю пранікла ў нашы сэрцы вестка аб узнагароджанні любімага горада ордэнам Леніна, гаворыць прамоўца. Ён напамінае аб мужнай барацьбе воінаў 100-й дывізіі імя Ул. І. Леніна, якая стрымлівала ворага пад Мінскам у чэрвені сорак першага года ў раёне Астрашыцкага гарадка і Заслаўля. Але сілы былі няроўнымі. Мінск быў захоплены гітлераўцамі. І усё ж ён не скарыўся. З першых дзён акупацыі тут разгарнулася поўная неверагодных цяжкасцей і небяспек падпольная работа камуністаў і камсамольцаў. Нягледзячы на самыя лютыя катаванні і пакаранні, якія прымянялі фашысцкія вылюдкі да падпольшчыкаў, да ўсіх мінчан, полымя барацьбы народных мсціўцаў разгаралася. Тут знайшоў сабе гібель крыважадны кат беларускага народа гаўляйтэр Кубэ, партызаны сталіцы і вобласці знішчылі тысячы фашысцкіх салдат і афіцэраў.

Як і многім мінчанам, студэнту А. А. Філімонаву прыйшлося прайсці з баямі тысячы кіламетраў да перамогі. Трэцяга чэрвеня 1944 года сталіца Беларусі была вызвалена ад захопнікаў. Цяжкай была дарога да перамогі. З жалем гаворыць прамоўца аб тых, хто аддаў сваё жыццё за свабоду і шчасце Радзімы. Вечны агонь на плошчы Перамогі, шматлікія помнікі і мемарыяльныя дошкі заўсёды будуць напамінаць аб стратах, панесеных савецкім народам у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Воляй савецкіх людзей, самаадданай працай мінчан сталіца Беларусі ўзрадзілася як буйнейшы індустрыяльны, культурны і навуковы цэнтр рэспублікі і ўсёй краіны. Навуковыя адкрыцці вучоных, мінскія трактары, самазвалы, станкі і іншая прадукцыя цяпер вядомы далёка за межамі Савецкага Саюза.

У першых шэрагах вучоных рэспублікі, заяўляе А. А. Філімонаў, ідуць супрацоўнікі нашага універсітэта. Мы бярэм на сябе абавязацельствы паўсядзённа ўзмацняць славу ордэнаноснага горада, дастойна сустрэць яго 900-годдзе, выдатнымі справамі адзначыць 50-годдзе Савецкай улады і 100-годдзе з дня нараджэння Ул. І. Леніна. Вышэй чырвоны сцяг Мінска, на якім ззяе ордэн Леніна!—так закончыў сваё выступленне Герой Савецкага Саюза А. А. Філімонаў.

З вялікім хваляваннем я даведаўся аб узнагародзе Мінска, гаворыць былы удзельнік партызанскага руху ў Мінскай вобласці дацэнт фізфака І. І. Пятроўскі. Ён расказвае аб той гераічнасці, якую праявілі мінчане ў барацьбе з ворагам. Яны не сталі на калені перад захопнікамі, а сумесна з усім савецкім народам кавалі перамогу.

І. І. Пятроўскі разам з іншымі народнымі мсціўцамі вызваляў Мінск. Вызваленне Мінска было вялікай радасцю, хоць яна і аказалася азмрочанай не меншым горам—Мінск ляжаў у руінах. Спатрэбілася шмат намаганняў для таго, каб аднавіць горад, ператварыць яго ў адзін з прыгажэйшых. Прамоўца звяртаецца да ўсіх з заклікам свята захоўваць у памяці імёны загінуўшых патрыётаў, памнажаць слаўныя традыцыі Мінска.

З вялікай падзякай да бацькоў і старэйшых братоў, адстаяўшых свабоду і незалежнасць любімай айчыны, шчаслівае юнацтва, звярнулася студэнтка другога курса філалагічнага факультэта Ларыса Краўчанка. Яна гаворыць, што ордэн Леніна на сцягу Мінска—гэта для студэнтаў універсітэта палымяная зорка у эстафеце, якую яны павінны несці ў спаборніцтве за выдатныя веды, за поспехі ў грамадскай дзейнасці, у працы. Мы павінны, заяўляе студэнтка, даць клятву партыі і народу, што будзем выхоўваць такіх, як Марат Казей, што аддадзім усе свае сілы і здольнасці далейшаму росквіту Радзімы.

Удзельнікі мітынгу ушаноўваюць памяць загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны мінутай маўчання.

Затым зноў і зноў у зале ўспыхваюць апладысменты ў гонар ордэнаноснага Мінска, кожны жадае яму новых поспехаў і перамог.

## *ВЯЛІКАЕ ПРЫЗНАННЕ*

Мне не прыйшлося быць да вайны ў Мінску, я упершыню ўбачыў гэты горад тады, калі вяртаўся ў родныя Дзяніскавічы, што на Піншчыне, пасля разгрому японскіх мілітарыстаў. Далёкім быў мой шлях да сталіцы Беларусі—партызанскія сцежкі, праследаванне адступаючага ворага па тэрыторыі Беларусі, Прыбалтыкі, Польшчы, Германіі, баі супраць японскіх самураяў... Ніколі не забыць тых цяжкасцей, якія перанесла наша краіна ў гады Айчыннай вайны. З болью ў сэрцы я хадзіў першы раз па разбуранаму Мінску і даў сабе слова, што вярнуся сюды, каб працаваць для яго росквіту. Разам з тысячамі мінчан у 1949 годзе я—першакурснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта ўдзельнічаў у нядзельніках: разбіраў руіны, садзіў ліпы на праспекце... Так, студэнты першых пасляваенных гадоў вельмі многае зрабілі для аднаўлення горада. Верныя памяці загінуўшых барацьбітоў, мы стараліся вучыцца на «выдатна» і «добра», хацелі стаць высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Цяпер я з упэўненасцю магу заявіць, што тыя, хто разам са мной вучыўся, добра працуюць, памнажаюць працоўную славу Мінска, іншых гарадоў і вёсак рэспублікі. Я не памылюся, калі скажу, што вялікая ўзнагарода нашай сталіцы—гэта і прызнанне ўрадам, краінай заслуг мінскага студэнцтва. Дык будзем жа і надалей высока несці сцяг перамог у камуністычным будаўніцтве.

А. КЛЯЎЧЭНЯ,
кандыдат філасофскіх навук,
дацэнт кафедры гісторыі філасофіі і логікі.

## Я ГАНАРУСЯ

Дарагая мая сталіца! Сёння я асабліва хвалююся, ідучы па тваіх праспектах, плошчах: ты атрымала вышэйшую ўзнагароду Радзімы — ордэн Леніна. Ты заслужыў яе, мой Мінск, мужны, працавіты. Я не бачыла цябе ў час вайны. Толькі па архіўных фотаздымках магу ўявіць сабе, якія раны нанеслі табе ворагі. Але і гэтага дастаткова, каб ацаніць тваю гераічнасць у барацьбе і працы.

Я ганаруся, што вучуся ва універсітэце, які глядзіць на цудоўнейшую плошчу Мінска — плошчу Леніна.

З узнагародай, слаўны горад! Са святам, жыхары сталіцы Беларусі!

Н. БАТУРЫЦКАЯ,
аспірантка
біялагічнага
факультэта.

## ТЫ СТАНЕШ ГОРАДАМ-ГЕРОЕМ

Святочны настрой выклікалі словы дыктара Беларускага радыё аб узнагароджанні Мінска ордэнам Леніна. Шчыра кажучы, гэтага ўжо даўно чакалі мінчане. Такога ўсенароднага прызнання яны заслужылі сваімі шматлікімі баявымі і працоўнымі подзвігамі. Ніякія цяжкасці, ахвяры не змаглі перашкодзіць сталіцы Беларусі стаць адным з прыгажэйшых гарадоў у нашай краіне.

Цяпер штодзённа Мінск рапартуе Радзіме аб сваіх вялікіх працоўных перамогах, аб тым, як хутка расце яго ўклад у паляпшэнне дабрабыту ўсіх савецкіх людзей, у павышэнне культурнага ўзроўню. Я хачу быць сведкай таго, калі наш цудоўны Мінск стане горадам — героем. Гэта будзе, абавязкова будзе!

М. АРЛОЎ,
студэнт першага
курса гістфака.



З кожным годам усё больш і больш расце і прыгажэе родны горад Мінск. Новыя шматпавярховыя дамы па вуліцы Ванеева.

Фота А. Кадзета.

## Партыйнае жыццё

# КРЫТЫЧНЫЯ ЗАЎВАГІ — ДА ВЫКАНАННЯ

У час правядзення справаздачна-выбарчых партыйных сходаў на факультэтах, а таксама на агульнауніверсітэцкім сходзе камуністамі было выказана многа слушных заўваг і прапаноў адносна паляпшэння ўсіх форм партыйнай работы. Днямі партыйны камітэт універсітэта на сваім пасяджэнні падагуліў гэтыя заўвагі і распрацаваў спецыяльны план мерапрыемстваў па іх рэалізацыі. Па кожным мерапрыемстве вызначан выканаўца і тэрмін выканання.

Так, з мэтай паляпшэння арганізацыйнай работы вырашана вылучыць у партыйных бюро факультэтаў адказнага за работу з маладымі камуністамі. У снежні месяцы адбудзецца партыйны сход кандыдатаў у члены КПСС. На пасяджэнні парткома будзе абмеркавана і пытанне аб рабоце маладых камуністаў у грамадскіх арганізацыях.

Улічваючы крытычныя заўвагі камуністаў у адрас гаспадарчай часткі універсітэта, сумесна з рэктарам вызначаны меры па паляпшэнню яе работы. На пасяджэнні парткома будзе заслухана пытанне аб забеспячэнні вучэбнага працэсу адміністрацыйна-гаспадарчай службай.

Запланавана правядзенне нарады партгрупоргаў курсаў і груп, дзе будзе абмеркавана пытанне аб ролі партыйных груп у арганізацыі вучэбнага працэсу і іх задачах ў павышэнні акадэмічнай паспяховасці. З гэтай жа мэтай у лютым на партыйных сходах факультэтаў вырашана падвесці вынікі зімняй экзаменацыйнай сесіі.

Многа цікавых мерапрыемстваў, запланаваных на бліжэйшыя тры месяцы, накіравана на паляпшэнне навукова-даследчай работы. Будуць заслуханы пытанні аб дзейнасці Навуковых Саветаў па прысуджэнню вучоных ступеней, а таксама аб навуковых даследаваннях на некаторых факультэтах, аб стварэнні новых лабараторый і г. д.

Асабліва падрабязна распрацаван план паляпшэння ідэйна-выхаваўчай работы. Мяркуецца вывучыць вопыт правядзення масава-палітычных і культурных мерапрыемстваў ва універсітэце і ўсё станоўчае шырока распаўсюдзіць. Будзе праведзены агляд мастацкай самадзейнасці, прысвечаны 50-годдзю Савецкай улады. Вырашана таксама ўзмацніць ваенна-патрыятычнае выхаванне студэнтаў. Ва універсітэце запланавана стварыць Савет ветэранаў вайны і абсталяваць Пакой баявой славы.

Вялікая ўвага аддаецца паляпшэнню работы шматтыражнай газеты, а таксама факультэцкіх насценных газет. У снежні месяцы адбудзецца нарада грамадскіх карэспандэнтаў газеты «Беларускі універсітэт» і рэдактараў факультэцкіх насценгазет.

Больш увагі будзе надавацца паляпшэнню работы сістэмы партыйнай асветы. Для сістэматычнага азнаямлення з ходам заняткаў у палітшколах і семінарах і аказання ім канкрэтнай дапамогі пры сектары палітычнай асветы ствараецца група актыву.

# АСНОЎНАЕ ЗВЯНО РАБОТЫ

На юрыдычным факультэце працуе пяць студэнцкіх партыйных груп, якія аб'ядноўваюць 113 членаў партыі і кандыдатаў. Сакратары партыйных груп маюць планы работы, аднак, як паказала праверка, у планах не адлюстраваны ўсе бакі дзейнасці груп. У прыватнасці, недастаткова ўдзяляецца ўвагі выкананню камуністамі іх партыйных даручэнняў.

У цэнтры ўвагі партыйных груп знаходзяцца пытанні вучэбна-выхаваўчай работы. Так, на першым курсе нядаўна быў праведзены сход, на якім разглядалася пытанне вучобы і дысцыпліны камуністаў. 30 лістапада адбыўся партыйны сход на другім курсе. Ён быў прысвечаны задачам павышэння авангарднай ролі камуністаў у падрыхтоўцы да зімняй экзаменацыйнай сесіі.

Большасць камуністаў факультэта маюць выдатную паспяховасць і дысцыпліну. Аднак у мінулым навучальным годзе некаторыя атрымалі нездавальняючыя адзнакі па шэрагу дысцыплін, у тым ліку па гісторыі КПСС (тт. Швараб, Разумаў, Татарэнка, Грыгор'еў — другі курс). Студэнт другога курса Дземідовіч быў выключаны з універсітэта за акадэмічную непаспяховасць і амаральныя паводзіны.

Нядаўна работа партыйных груп юрфака разбіралася на пасяджэнні партыйнага камітэта. Прынята рашэнне, у якім падкрэсліваецца неабходнасць павышэння кантролю за выкананнем камуністамі партыйных даручэнняў, сістэматычнай работы з кандыдатамі ў члены партыі, клопатаў аб побыце студэнтаў, паляпшэнні спартыўнай і абаронна-масавай работы.

Партыйны камітэт абавязаў партыйнае бюро юрфака сістэматычна і ўсебакова займацца дзейнасцю партыйных груп.

# КАБ АДЧУВАЦЬ ПЛЯЧО СЯБРА

**На вуліцы сыпле і сыпле сняжок. Яго становіцца ўсё больш і больш. Зіма прынесла з сабой радасці лыжных паходаў і іншых цікавых форм адпачынку. Але чым больш сілы набірае зіма, тым адчувальней становіцца подых сесіі. Аб паспяховай яе здачы клапоцяцца і самі студэнты, і рэктарат, і партком, і камітэт камсамола, і дэканаты, і выкладчыкі. Асаблівая ўвага ўдзяляецца першакурснікам. Як рыхтавацца да сесіі, як правільна размеркаваць свой час, на якія дысцыпліны трэба звярнуць галоўную ўвагу, што рабіць дзеля таго, каб як мага больш ведаў давалі лекцыі, практычныя заняткі! Гэтыя і многія іншыя пытанні былі зместам размовы камсамольскага сходу першакурснікаў юрыдычнага факультэта.**

**У выступленнях прысутных адчувалася, што асноўная маса студэнцтва актыўна ўключылася ў падрыхтоўку да сесіі, што першакурснікі шмат увагі ўдзяляюць павышэнню свайго спецыяльнага і агульнаадукацыйнага ўзроўню. З вялікай цікавасцю выслухалі камсамольцы выступленні выдатнікаў вучобы старэйшых курсаў Георгія Дарогіна і Васіля Трацякова, якія расказалі аб сваім вопыце падрыхтоўкі да экзаменаў, аб рабоце над першакрыніцамі.**

**Дэкан факультэта В. А. Шкурко пазнаёміў камсамольцаў з умовамі здачы экзаменаў у вышэйшай школе, а таксама адказаў на шматлікія пытанні, якія цікавілі першакурснікаў у сувязі з надыходзячай сесіяй.**

**На сходзе вырашана замацаваць студэнтаў Грашчука, Астрамовіча, Віткоўскага, якія паказваюць добрыя вынікі ў вучобе, за адстаючымі. Яны будуць дапамагаць сваім малодшым калегам у вучобе.**

**Вялікая ўвага адводзілася таксама і пытанню расклада здачы экзаменаў. Нельга дапусціць такога становішча, каб некалькі груп адразу рыхтаваліся па аднаму і таму ж прадмету. У гэтым выпадку падручнікаў у кабінетах, і бібліятэках, вядома, на ўсіх не хопіць.**

**Быў зроблены справядлівы папрок першакурснікам за тое, што яны слаба карыстаюцца паслугамі вучэбных кабінетаў.**

**На факультэце ў бліжэйшы час будзе створана акадэмічная камісія ў складзе прадстаўнікоў ад партбюро, камітэта камсамола і прафбюро. Яна будзе займацца пытаннямі падрыхтоўкі студэнтаў да сесіі і яе арганізацыі.**

**Галоўнае тое, што на сходзе адчувалася неабходнасць, не марудзячы часу, усім сур'ёзна ўзяцца за вучобу. За апошнія тыдні многае можна яшчэ зрабіць. А ўзнагародай за ўсё будуць добрыя і выдатныя адзнакі ў залікоўках.**

**Уладзімір МІЛЬТО,**
**член камітэта камсамола юрфака.**



*У вольны ад заняткаў час студэнты падрыхтоўчага факультэта сістэматычна знаёмяцца са сталіцай Беларусі—Мінскам. Яны ўжо пабывалі ў гасцях у школьнікаў горада, у дзіцячых садах, у рабочых калектывах, музеях, тэатрах. Наш няштатны карэспандэнт С. Рабцэвіч сфатаграфаваў групу студэнтаў з замежных краін, якія накіроўваюцца на чарговую сустрэчу з савецкімі сябрамі.*

# СЕМІНАР РЭДАКТАРАЎ НАСЦЕННЫХ ГАЗЕТ

**16 снежня, у пятніцу, у памяшканні рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» адбудзецца семінар рэдактараў насценных факультэцкіх газет. Удзельнікамі будуць разгледжаны пытанні аб ролі насценнага друку ў падрыхтоўцы да зімовай экзаменацыйнай сесіі, як асвятляецца імі жыццё, побыт і запатрабаванні студэнцтва, а таксама аб кіраўніцтве рэдкалегіямі партыйнымі бюро факультэтаў. Перад удзельнікамі выступяць: рэдактар насценнай газеты біялагічнага факультэта «Vita», загадчык партыйнага аддзела газеты «Беларускі універсітэт» Ул. А. Кулажанка і супрацоўнік Ленінскага райкома ЛКСМБ.**

## Справы бібліятэчныя

# І ТУТ ГРУКАЕ СЕСІЯ

Надыходзячая сесія настойліва грукае ў дзверы не толькі аўдыторый, лабараторый, метадычных кабінетаў, але і бібліятэк. Тут пульс сесіі становіцца з кожным днём усё больш і больш адчувальным. У паўнюткіх залах ідзе напружаная работа. Асабліва стараюцца студэнты першых курсаў. Першая сесія для іх—першае сур'ёзнае выпрабаванне на права далейшай вучобы ў вышэйшай навучальнай установе.

У мінулым нумары газеты расказвалася ўжо, як ідуць справы ва універсітэцкай бібліятэцы. Сёння пойдзе гаворка пра бібліятэку юрыдычнага факультэта. Яе дырэктар В. П. Ананька расказвае:

— Усе нашы клопаты цяпер накіраваны на тое, каб поўнасцю забяспечыць студэнтаў неабходнай літаратурай, унесці свой дастойны ўклад у паспяховую здачу імі экзаменаў. Вядома, што на факультэце ў гэтым годзе адкрыта новае аддзяленне — эканамічнае, таму мы набылі шмат неабходнай вучэбнай літаратуры для эканамістаў, значна папоўніўся і фонд кніг па крыміналістыцы, па гісторыі дзяржаўнага права і іншых дысцыплінах.

У гутарцы з работнікамі бібліятэкі высвятляецца, што калектыў робіць многа для таго, каб своечасова і без асаблівых затрат часу забяспечыць студэнтаў неабходнай літаратурай. Пахвальна і тое, што асабліва ў час сесіі бібліятэкары выдаюць літаратуру не толькі юрыстам, але і філолагам, студэнтам іншых факультэтаў.

Хаця бібліятэка невялікая па свайму кніжнаму фонду і па колькасці абслугоўваючых работнікаў, але яе паслугамі карыстаецца 2.300 чалавек. Такая колькасць чытачоў для гэтай бібліятэкі — несумненны поспех. Прычынай гэтаму з'яўляецца, відаць, тое, што бібліятэкары шмат ўвагі ўдзяляюць умацаванню творчых сувязей з наведвальнікамі, клапоцяцца аб іх запатрабаваннях. Тут часта наладжваюцца дыспуты аб кнігах, баявых старонках з жыцця выдатных сыноў Камуністычнай партыі, аб гераічнай барацьбе савецкага народа з фашысцкімі захопнікамі, аб шматгранным развіцці сацыялістычнага права, дэмакратыі. Вось некаторыя з іх: «Пытанні дзяржавы і права ў працах Ул. І. Леніна», «Суд, законнасць і мастацкая літаратура», «Вобраз савецкіх чэкістаў у кіно» і іншыя.

Дыспуты і гутаркі дапамагаюць студэнтам-юрыстам лепш замацоўваць атрыманыя на лекцыях і практычных занятках веды, глыбей авалодваць сакрэтамі сваёй будучай прафесіі.

Н. АЛЯКСЕЕВА.

# ЧАСОПІСЫ І ГАЗЕТЫ—КОЖНАМУ

**Запатрабаванні студэнтаў нашага універсітэта— шматгранныя. Лекцыі, семінары, сустрэчы з выдатнымі людзьмі горада і рэспублікі, вечары адпачынку, захапляючыя падарожжы па дарогах баявой і працоўнай славы бацькоў, а таксама многія іншыя мерапрыемствы, накіраваныя на павышэнне як спецыяльнага, так і агульнаадукацыйнага ўзроўню былі б далёка не поўнымі без незвычайнай цікаўнасці студэнцтва да перыядычнага друку. Рубрыкі «Да 50-годдзя Савецкай улады», «Насустрач 100-годдзю з дня нараджэння Ул. І. Леніна», матэрыялы аб тым, як на справе выконваюцца рашэнні партыі і ўрада прыцягваюць вялікую ўвагу кожнага. Малодшае, пасляваеннае пакаленне дапытліва ўнікае ў нарысы і артыкулы аб героях грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны, аб самаадданых працаўніках горада і вёскі, якія сваёй працай з кожным днём набліжаюць светлае будучае — камунізм, аб слаўных сынах Камуністычнай партыі.**

**Вядома, падрабязна даведацца аб гэтым без перыядычнага друку немагчыма. Відавочна, пагэтаму арганізавана прайшла нядаўняя падпіска на газеты і часопісы сярод выкладчыкаў і студэнтаў нашага універсітэта. На 1967 год выпісана перыядычных выданняў на 3 тысячы экзэмпляраў больш, чым у мінулым. Асабліва добра яна была арганізавана на падрыхтоўчым факультэце, дзе падпіскай ахоплены ўсе супрацоўнікі. 1 300 часопісаў і газет выпісалі выкладчыкі і студэнты фізфака. Больш чым па тысячы перыядычных выданняў будуць мець і іншыя факультэты універсітэта. Характэрным для падпіскі на 1967 год з'яўляецца тое, што вялікую цікаўнасць у студэнтаў выклікаюць партыйныя выданні, асабліва часопіс «Малады камуніст».**

**Спісы па падпісцы стракацяць таксама рознымі назвамі выданняў з сацыялістычных краін. Падпіска, якая праводзілася пад дэвізам — газету ці часопіс—кожнаму студэнту — ва універсітэце выканана на «выдатна».**

**Г. МАЦУК,**
**студэнт першага курса аддзялення журналістыкі.**